**ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» прымае ўдзельнікаў Рэспубліканскага семінара**

З 17 па 19 кастрычніка ў Ашмянскім раёне праходзіў семінар з работнікамі структурных падраздзяленняў абласнога і мінскага гарадскога ўпраўленняў фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, якія ажыццяўляюць кадравую і прававую працу.

18 кастрычніка 2018 года госці дадзенага семінара наведалі адміністрацыйны корпус і аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна». Удзельнікі семінара былі азнаёмлены з паслугамі, якія прадастаўляе сацыяльна-неабароненым грамадзянам. У аддзяленні дзённага знаходжання была арганізавана экскурсія і невялікі канцэрт. Атрымалі станоўчыя водгукі ад удзельнікаў семінара. Па іх думцы, аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту - гэта цёплы і ўтульны куток, дзе цёпла і камфортна кожнаму, тут кожны можа знайсці занятак па душы.

Мы заўсёды рады бачыць гасцей і новых наведвальнікаў.

Сардэчна запрашаем!




